# Што такое кібербулінг?

Кібербулінг - гэта цкаванне з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій.

Кібербулінг можа адбывацца ў сацыяльных сетках, месэнджарах, на гульнявых платформах і ў мабільных тэлефонах.

Гэта мэтанакіраваная мадэль паводзін, якая ставіць сваёй задачай запалохаць, раззлаваць ці зганьбіць таго, хто стаў аб'ектам цкаваньня.

**Прыкладамі кібербулінгу з'яўляюцца:**

1. распаўсюджванне ілжывай інфармацыі або фатаграфій каго-небудзь у сацыяльных сетках, што ставіць чалавека ў няёмкае становішча

2. адпраўка крыўдлівых паведамленняў або пагроз у мэсэнджэрах

3. выдача сябе за кагосьці іншага і адпраўка непрымальных паведамленняў іншым ад яго імя.

Траўля ў асабістых зносінах і кібербулінг часта могуць адбывацца адначасова.

Але кібербулінг пакідае лічбавы след, які можа апынуцца карысным і можа выкарыстоўвацца ў якасці доказу для таго, каб спыніць злоўжыванні.

**Крыніца:** https://rcek.by/be/kiberbulling/